# § 22. Расія ў пачатку XVII ст. Смутны час

1598 г. 1605 г. 1606—1607 гг. 1612 г.

**Успомніце.** *Якія наступствы для Расіі мела палітыка Івана Грознага? З якімі праблемамі сутыкнулася дзяржава?*

Пачатак XVII ст. быў асабліва цяжкі для рускага народа. У краіне выбухнула грамадзянская вайна. Пачалося іншаземнае ўварванне. З'явіліся самазванцы, якія называлі сябе царамі. Смута — хваляванні і беспарадкі — ахапіла ўсю Расійскую дзяржаву. Краіна апынулася на мяжы гібелі, але дзякуючы намаганням усяго народа яна здолела выжыць і адстаяць сваю незалежнасць.

**Вы даведаецеся.** *Чаму ў Расіі пачаўся Смутны час. Чым гэта пагражала краіне. Як рускі народ здолеў адстаяць незалежнасць сваёй краіны.*

**1. Кіраванне Барыса Гадунова і пачатак Смуты.** Іван Грозны пакінуў пасля сябе двух сыноў. Іх лёс склаўся трагічна. Царэвіч Дзмітрый Іванавіч загінуў пры загадкавых абставінах (1591). Старэйшы сын, цар Фёдар I (гады праўлення — 1584–1598), быў вельмі хваравіты і таму не мог займацца дзяржаўнымі справамі. Краінай фактычна кіраваў брат яго жонкі баярын ***Барыс Гадуноў***. Цар Фёдар памёр бяздзетным. З яго смерцю перапынілася дынастыя Рурыкавічаў. Усё завяршылася тым, што ў 1598 г. Земскі сабор абраў на царскі трон Барыса Гадунова, які вызначыўся падчас апрычніны. Ён быў першым рускім царом, які атрымаў трон не ў спадчыну, а шляхам выбараў.

212—213



Барыс Гадуноў.
Парсуна (партрэт) XVII ст.

Барыс Гадуноў абапіраўся не на баяр. Ён імкнуўся заручыцца падтрымкай служылых лю-

дзей — дваранства, а таксама вышэйшага духавенства і гараджан. У інтарэсах памешчыкаў у 1597 г. быў усталяваны 5-гадовы тэрмін росшуку беглых сялян і халопаў («урочныя леты»). Дзякуючы намаганням Гадунова праваслаўная царква атрымала поўную самастойнасць. У 1589 г. на Русі ўводзілася патрыяршаства. Масква стала адным з цэнтраў праваслаўнага свету.

Цалкам паспяховай была знешняя палітыка Гадунова. Яму ўдалося дабіцца ад Швецыі вяртання рускіх зямель, страчаных у гады Лівонскай вайны. Пашырыўся гандаль з Англіяй, Галандыяй і Персіяй. У Расію запрашаліся іншаземцы для працы гадзіншчыкамі, аптэкарамі, лекарамі і г. д. Некалькі дваранскіх дзяцей былі накіраваныя для вывучэння навук за мяжу, але яны так і не вярнуліся дадому, відавочна, праз хуткі надыход Смутнага часу.

Такім чынам, кіраванне цара Барыса пачыналася паспяхова. Краіна паступова «прыходзіла ў сябе» пасля разрухі, звязанай з кіраваннем Івана Грознага. Але неўзабаве на яе абрынуліся страшныя бедствы. 1601—1603 гг. у Расіі выдаліся надзвычай халоднымі і неўрадлівымі. Большую частку яе еўрапейскай тэрыторыі ахапіў масавы голад, успыхнулі эпідэміі. Натоўпы галодных, зняверaных людзей рынуліся ў сталіцу ў пошуках пракорму. Цар загадаў бясплатна раздаваць хлеб з царскіх сховішчаў, але запасаў у іх усё адно не ставала.

*Назавіце станоўчыя і адмоўныя вынікі дзейнасці Барыса Гадунова.*
*Як вы ацэньваеце яго ролю ў гісторыі Расійскай дзяржавы?*

Вялікі голад змяніў становішча ў дзяржаве, перапыніў многія пачынанні цара. У народзе пайшлі пагалоскі пра «кару нябесную». Шмат хто з баяр, праціўнікаў Гадунова, не хаваў сваёй радасці з нагоды цяжкасцей, якія напаткалі царскі ўрад. Незадаволенасць царом ахапіла амаль усе пласты насельніцтва. Выбухнулі народныя бунты, сялянскія паўстанні, якія былі жорстка задушаныя арміяй.

**2. Пачатак грамадзянскай вайны. Ілжэдзмітрый I.** У гэты ж час пачалі распаўсюджвацца чуткі пра тое, што царэвіч Дзмітрый жывы і неўзабаве прыйдзе чыніць справядлівы суд. Царэвіч, які «цудам уратаваўся», або ***Ілжэдзмітрый I***, аб'явіўся ў Рэчы Паспалітай. Яго асоба дасюль не



Прысяга Ілжэдзмітрыя І польскаму каралю і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту III на ўвядзенне ў Расіі каталіцызму. Мастак *Мікалай Неўраў*. 1874 г.

вызначаная. Шмат хто лічыць, што гэта быў беглы манах Рыгор Атрэп'еў. Яго падтрымалі кароль Жыгімонт III, магнаты і шляхта. Яны ўхвалілі план паходу «царэвіча» на Маскву і яго ўзыходу на расійскі трон.

У кастрычніку 1604 г. Ілжэдзмітрый І на чале невялікага войска (3 тыс. чалавек) уступіў у межы Расійскай дзяржавы і рушыў на Маскву. Урадавыя войскі разбілі самазванца. Але яго моц была не ў войску. Ён сапраўды карыстаўся падтрымкай народа і казацтва. Шмат людзей верыла ў тое, што перад імі «законны» нашчадак трона і «сапраўдны» цар. Ён «добры», таму збавіць іх ад уціску баяр і дваранства.

*Як вы мяркуеце, чаму Рыгора Атрэп'ева падтрымаў кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III?*

248—249

Да войска Ілжэдзмітрыя І далучаліся незадаволеныя казакі, сяляне, служылы люд. Нават некаторыя баяры падтрымалі самазванца. Адзін за адным царэвіча прызнавалі рускія гарады. Так са з'яўленнем Ілжэдзмітрыя І у Расіі пачалася Смута, якая перарасла ў грамадзянскую вайну.

Пасля раптоўнай смерці Барыса Гадунова ў 1605 г. на бок самазванца перайшла значная частка царскага войска. Ілжэдзмітрый І свабодна ўступіў у Маскву. Натоўпы народу сустракалі яго хлебам-соллю. Людзі

213—214

сапраўды верылі ў тое, што ён нашчадак законнай дынастыі Рурыкавічаў. Народ звязваў з новым царом спадзяванні на спыненне «гневу божага».

Аднак становішча ў краіне не палепшылася. Скарыстаўшыся гэтым, баярскія вярхі ўчынілі расправу над Ілжэдзмітрыем I у 1606 г. Арганізатарам перавароту з'яўляўся князь Васіль Шуйскі. Групай сваіх аднадумцаў ён і быў названы новым царом. Пры яго кіраванні хваляванні і беспарадкі не спыніліся, а набылі нечуваны размах. Хваля народных выступленняў пракацілася па паўднёвых ускраінах краіны. Самым масавым было паўстанне пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава. Атрады паўстанцаў разграмілі войска Васіля Шуйскага, але ўзяць Маскву ім не ўдалося. У кастрычніку 1607 г. Іван Балотнікаў быў схоплены і пазней пакараны смерцю.

209—210

214—215

**3. Ілжэдзмітрый II. Замежная інтэрвенцыя.** Адразу ж пасля смерці Ілжэдзмітрыя I зноў папаўзлі чуткі пра «дзівоснае ўратаванне» і хуткае вяртанне цара Дзмітрыя. У 1607 г. у Рэчы Паспалітай аб'явіўся новы самазванец — Ілжэдзмітрый II. Яго сапраўднае імя і паходжанне дагэтуль дакладна не ўстаноўлены. За спінай чарговага самазванца, як і ў першым выпадку, стаяла Рэч Паспалітая. Яна ж накіроўвала і кантралявала ўсе яго дзеянні. Войска Ілжэдзмітрыя II складалася са шляхціцаў, паўднёварускіх дваран, казакаў і рэшткаў разбітага войска Балотнікава. На вернасць Ілжэдзмітрыю прысягнула значная частка рускіх зямель. Нават некаторыя баярскія сем'і падтрымлівалі з ім цесныя стасункі. Аднак працяглая аблога Масквы поспехам не ўвянчалася. Напрыканцы 1610 г. самазванец у выніку сваркі быў забіты сваёй татарскай вартай.

*Як вы лічыце, чаму рускі народ так верыў у самазванцаў і падтрымліваў іх?*

Скарыстаўшыся Смутай, ваенныя дзеянні супраць Расіі ў 1609 г. распачала Рэч Паспалітая, а ў 1610 г. — Швецыя, якая імкнулася захапіць паўночныя і паўночна-заходнія землі Расіі. Руская армія не здолела спыніць прасоўванне непрыяцельскіх войскаў. У гэтых складаных умовах група маскоўскіх баяр-змоўшчыкаў у ліпені 1610 г. адхіліла ад улады Васіля Шуйскага. Ён быў гвалтоўна пастрыжаны ў манахі, а затым апынуўся ў польскім палоне, дзе і памёр у зняволенні.

211—212

Пасля скідання цара быў створаны ўрад з сямі баяр, вядомы як «сямібаяршчына». Новае кіраўніцтва Расіі пайшло на змову з Жыгімонтам III. Спачатку яно прызнала яго сына каралевіча Уладзіслава рускім царом, а ў ноч на 21 верасня 1610 г. патаемна ўпусціла ў Маскву войскі Рэчы Паспалітай. Фактычна правіцелем Расіі зрабіўся камандуючы польскімі войскамі.

**4. Народнае апалчэнне пад кіраўніцтвам Мініна і Пажарскага.** Дзеянні баярскага ўрада выклікалі хвалю народнага гневу. Істотную ролю ў аб'яднанні народа адыграла Руская праваслаўная царква. Патрыярх Гермаген рассылаў граматы ва ўсе канцы краіны, заклікаючы да барацьбы з інтэрвентамі. У Ніжнім Ноўгарадзе земскі стараста Кузьма Мінін сфарміраваў апалчэнне з рускіх і народаў Паволжа для вызвалення Масквы. Палкаводцам быў абраны князь Дзмітрый Пажарскі.

Увесну 1612 г. апалчэнне рушыла на сталіцу. Увосень таго ж года пасля непрацяглай аблогі Масква была вызваленая. Народнае апалчэнне выканала сваю гістарычную задачу барацьбы з інтэрвенцыяй. Расія адстаяла незалежнасць, Смута і грамадзянская вайна скончыліся.

Канфлікт са Швецыяй завяршыўся ў 1617 г. Расія змагла вярнуць частку сваіх тэрыторый. Аднак выхад да Балтыйскага мора быў страчаны.



Заклік Кузьмы Мініна да ніжагародцаў. Мастак *Аляксей Кіўшэнка.* 1880-я гг.

**Зварот Кузьмы Мініна да ніжагародцаў**

— Браты! — звярнуўся Мінін да скупчаных у саборы землякоў сваіх. — Не пашкадуем нічога, каб дапамагчы рускай дзяржаве! Пачнём першыя! Якая ж вялікая хвала будзе ўсім нам ад рускай зямлі, калі ад такога малога горада, як наш, пойдзе святая справа ўратавання радзімы! Я ведаю: як толькі возьмемся мы за гэта, дык і іншыя гарады да нас прыстануць, і мы пазбудземся ярма чужаземцаў…

Велізарны натоўп запоўніў цяпер Саборную плошчу… І сталі людзі ніжагародскія тут жа зносіць Мініну на плошчу ўсялякае дабро. Неслі грошы, залатыя маністы, каштоўнае каменне і жэмчуг, кавалкі парчы і сукна. А хто не меў нічога за душой, той здымаў з сябе медны крыж і клаў яго ў агульную груду на агульную справу.

*Чаму рускі народ актыўна падтрымаў Кузьму Мініна? Пра якое маральнае пачуццё сведчыць гэтая падтрымка?*

*Такім чынам, перыяд Смуты і грамадзянскай вайны быў адным з самых трагічных у гісторыі Расійскай дзяржавы. Коштам неверагодных намаганняў рускаму народу ўдалося абараніць сваю незалежнасць і прыступіць да аднаўлення спустошанай краіны.*

***Ключавыя словы:*** *Барыс Гадуноў, Ілжэдзмітрый І, Смута, народнае апалчэнне, Кузьма Мінін, Дзмітрый Пажарскі.*

### Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце час кіравання Барыса Гадунова па наступным плане: а) як ён прыйшоў да ўлады; б) на якія пласты насельніцтва абапіраўся; в) як кіраваў дзяржавай.
2. Патлумачце, чаму падзеі пасля смерці Барыса Гадунова атрымалі назву «Смутны час». Назавіце прычыны Смуты.
3. Складзіце схему «Змена ўлады ў Смутны час».
4. Якія краіны ўзялі ўдзел у інтэрвенцыі ў Расію? Для чаго?
5. Якую ролю ў вызваленні Расіі ад інтэрвентаў адыгралі патрыярх Гермаген, Кузьма Мінін і Дзмітрый Пажарскі? Ці можна вызваленне краіны разглядаць толькі як іх заслугу?
6. Складзіце летапіс падзей Смутнага часу.
7. Даведайцеся, у якіх гарадах пастаўлены помнікі Кузьму Мініну і Дзмітрыю Пажарскаму. Чаму менавіта ў гэтых гарадах?